## Першамайская.

Музыка А. Туранкова.

ДАВОЛІ ХУТКА, ВЕСЕЛА






1. Вось ідзе наш Май вясёлы —
Свята светлае дзяцей.
У прасторы звоняць пчолы,
Ляцяць з мёдам у вулей.

Прыпеў:

Звонка песню заспяваем,
Разам стрэнем весялей
Першы дзень вясёлы Мая — } 2 разы.
Свята светлае дзяцей.

2. Зелянеюць сенажаці,
Сонца ясна зіхаціць,
Сталі птушкі шчабятаці
З лесам, з сонцам гаманіць.
**Прыпеў.**

3. Пад чырвоны сцяг народны
Выйсці з хат павінны ўсе,
Ўспомніць майскі дзень Свабоды —
У песнях, сонечнай красе.
**Прыпеў.**

4. Так пад сцягам пад чырвоным
Люд працоўны ўсіх краёў
Сустракае Май зялёны,
Што на радасць нам прыйшоў.
**Прыпеў.**

# Піянерская паходная.

Словы Э. Агняцвет. Музыка У. Алоўнікава.






1. Хаваецца за сёламі
Вячэрняя зара,
Яна пяройдзе ў полымя
Паходнага кастра.
Сцяжынкаю нязнанаю
Прыйшлі ў зялёны бор,
І песня над палянаю:
«Гары, гары, касцёр!» } 2 разы.

2. А сосны, як важатыя,
Не зводзяць з нас вачэй,
І гальштукі крылатыя
За полымя ярчэй.
Якое неба зорнае,
Якая прыгажосць!
Твая зямля прасторная,
Ты — гаспадар, не госць! } 2 разы.

3. Твае суніцы спелыя,
Арэхі і грыбы,
Стаяць бярозы белыя,
Магутныя дубы.
І кліча сцежка кожная,
І кліча кожны гай.
У нас — зямля прыгожая,
У нас — багаты край. } 2 разы.

## Лагерная песня.

Слова Л. Лаврова. Музыка Д. Кабалевского.



1. Там, где травы,
Где дубравы
Шелестят в тиши,
Перелески
В тёмном блеске
Очень хороши.

2. Там бывали,
Там стояли
Наши лагеря,
Нас встречала,
Умывала
Алая роса.

3. Там степные,
Кружевные
Мчались облака,
Голубая,
Улыбаясь,
Булькала река.

4. В эту воду
Прямо с ходу
Только прыгнешь там,
И взовьются,
Понесутся
Брызги к небесам.

5. А потом
Гремели песни
С нами на ходу,
Мы ещё
Туда поедем
В будущем году.

6. А сегодня
Мы свободней
Встанем за дела,
Чтобы к лету,
Чтобы к свету
Книга нас вела.

7. Вы степные,
Кружевные
Мчитесь, облака,
Разливайся,
Раздавайся,
Синяя река!

# Лясны аганёк.

Словы А. Астрэйкі. Музыка М. Лагуна.






1. Мы са школай развіталіся
Да асенняе пары.
Школьнай мы сям'ёй сабраліся
Ў лес зялёны ў лагеры.

Прыпеў:

Ой ты, вецер, вецярок, вецярок, вецярок,
Не тушы наш аганёк, аганёк, аганёк.
Там, дзе ёсць аганёк, } 2 разы.
Там у будучыню крок.

2. Партызаны тут змагаліся,
Нашы бацькі і браты.
Адпачыць сюды сабраліся
Мы пад сцяг свой залаты.
Прыпеў.

3. Ходзіць, вее па сасонніку
Цёплай ласкай вецярок,
Змоўклі, сціхнулі гармонікі,
Ды не гасне аганёк.
Прыпеў.

# Кліча вецер свежы.

Словы Э. Агняцвет. Музыка П. Падкавырава.




1. Праз лугі-разлогі,
Паміж рэчак звонкіх,
Пралеглі дарогі
Роднае старонкі. } 2 разы.

2. Па адной дарозе
Пад Барысаў пойдзеш —
На рацэ Бярозе
Запаведнік знойдзеш. } 2 разы.

3. Там у сінім змроку
Ёсць ласі, куніцы,
Там на кожным кроку —
Смачныя суніцы. } 2 разы.

4. Кліча вецер свежы
Да другой дарогі.
Вабяць з даляў вежы,
Вабіць замак строгі. } 2 разы.

5. Па шляху заходнім,
Цераз пушчаў гоман,
Мы ідзём да Гродні,
Дзе лагодны Нёман. } 2 разы.

6. Кожны кут радзімы —
Гэта быль і казка.
Кліча край любімы:
— Дзеці, калі ласка! } 2 разы.

7. І вакол устане
Новы свет прыгожы...
Добра летнім раннем
Выйсці ў падарожжа. } 2 разы.

# Дарога.

Словы П. Пранузы. Музыка В. Жубінскай.

У ТЭМПЕ МАРША






З вясёлай, звонкай песняю
Выходзім мы з сяла.
Дарога нас паклікала
І ранкам павяла
Палеткамі ўрадлівымі
Дзе ячмяні, аўсы,
Па ягады даспелыя
У ціхія лясы.
Па рыбу серабрыстую
Да быстрае ракі,
Па кветкі-краскі яркія
На гожыя вянкі.
Мы прыцемкам вяртаемся,
Спіць рэчка, дрэмле гай.
Дарога стужкай роўнаю
Бяжыць за неба край.

# У паход.

(Песня юных краяведаў.)

Словы Н. Гілевіча. Музыка І. Кузняцова.






1. За партаю старанна
Вучыліся ўвесь год,
А сёння на світанні
Выходзім мы ў паход.

Прыпеў:

Дарога ўецца,
Песня наша льецца,
Вітанне шлюць палі, бары.
А сіні ранак
Кліча нас уперад,
Уперад, юныя сябры!

2. Маршрут для нас вядомы,
І компас у руках,
Не ведаючы стомы,
Мы пройдзем гэты шлях.

Прыпеў.

3. Па ўсёй старонцы пройдзем
І знаем — недарма:
Такія скарбы знойдзем,
Якіх яшчэ няма.

Прыпеў.

4. Гучыце ж, песні, звонка!
Нам радасна ісці.
Як наша старонка —
На свеце не знайсці.

Прыпеў.

## Як крыніца цячэ.




1. Як крыніца цячэ,
Наша ўлада расце —
Ўлада нашая
Ды савецкая. } 2 разы.

2. І расце, і цвіце,
І жыццё нам дае —
Ды вясёлае,
Ды шчаслівае. } 2 разы.

3. А хто шчасце нам даў,
Хто жыццё збудаваў?
Ўлада нашая
Ды савецкая. } 2 разы.

## Узышоў свецел месячык.

(Сучасная беларуская народная песня.)



1. Ўзышоў свецел месячык,
Ясная зара,
Асвяціў дарожаньку
Цёмнага сяла. 2 разы.

2. Была ж ты, дарожанька,
Непрыгляднаю,
Стала ж ты, дарожанька,
Ненагляднаю. 2 разы.

3. Шыроку дарожаньку
Ленін пратарыў,
Пракладку дарожанькі
Наш народ звяршыў. 2 разы.

4. Цяпер нам дарожанька
Вольная дана:
Працаваць машынамі,
Вадзіць трактара. 2 разы.

## Із далёкіх із краеў.

У ТЭМПЕ МАРША




1. Із далёкіх із краеў
Шлі салдацікі дамоў.
Эй, шлі салдацікі дамоў!

2. Па вузенькай дарожцы
Запыліла вочы ім.
Эй, запыліла вочы ім.

3. То пясочак, то не дым,
То Радзіма — не Берлін!
Эй, то Радзіма — не Берлін!

4. Вот і роднае сяло
На прыгорачку відно.
Эй, на прыгорачку відно!

5. Выхадзіце, сёстры, брацця,
Пераможцаў сустракаці.
Эй, пераможцаў сустракаць!

6. Із далёкіх із краеў
Шлі салдацікі дамоў.
Эй, шлі салдацікі дамоў!

## Песня пра Заслонава.






1. На магіле ружы расцвітаюць,
Шэпча бэз над кветкамі вяргінь,
А ў магіле спіць герой савецкі —
Партызан Заслонаў Канстанцін. } 2 разы.

2. Не салоўка голасам пявучым
Над ракой калыша ціхі гай,
Гэта мы яму спяваем песню
Пра любімы, родны, вольны край. } 2 разы.

3. У дрымучых у лясах аршанскіх
Гэтай песні ён не даспяваў,
Ад смяротнай кулі ад фашысцкай
За радзіму вольную ён паў. } 2 разы.

4. Беларусь, ты бацькаўшчына наша,
Ўдаль і ўшыр прасторам ты лягла,
Кветкай яркай, кветкаю прыгожай
Між рэспублік вольных расцвіла. } 2 разы.

5. Ой, з-за лесу-бору, па-над хатай
Ясна свеціць сонца цераз тын,
Мы табе пяём сягоння славу,
Наш герой — Заслонаў Канстанцін. } 2 разы.

# Вясёлая старонка.

(Рэвалюцыйная песня Заходняй Беларусі.)




1. Вясёлая старонка,
Дзе сонейка ўсходзіць,—
Народ беларускі
Вачэй стуль не зводзіць. } 2 разы.

2. Хоць сёння нам вочы
Раса выядае,
Мы верым, што скора
Нам сонца заззяе. } 2 разы.

3. Сагрэе зямельку,
Засвеціць у хаты,
Растопіць ў астрогах
Жалезныя краты. } 2 разы.

4. І станем мы дружна
На шлях на калгасны,
Як прыйдзе з Усходу
Да нас той дзень ясны. } 2 разы.